■ Таямніцы і адкрывальнікі

«ПАМЯРКОЎНЫ» — ГЭТА НЕ ПРА БЕЛАРУСАЎ

Адзін з аўтараў гістарычных тэлевізійных расследаванняў раскрывае сакрэты жыццяпісу народа

Міхась Равуцкі — асоба на беларускім тэлебачанні вядомая. Загадчык аддзела навін культуры АТН, ён часта з'яўляецца ў выпусках «Панарамы» ў тэматычных рэпартажах, у штотыднёвай праграме «Пра мастацтва». Але мы вырашылі пагаварыць з ім не як з медыяперсонай, а як з аўтарам гістарычных саг-расследаванняў, якія выклікалі вялікі рэзананс сярод гледачоў і за якія Міхась Равуцкі разам са сваімі калегамі Аленай Борматавай і рэжысёрам Марыяй Жукавай атрымаў сёлета спецыяльную прэмію Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва.
«Слуцкія паясы. Тайныя знакі», «Радзівілы. Таямніцы сям'і», «Нацыянальная дылогія. Статут ВКЛ», «Нацыянальная трылогія. Герб. Гімн. Флаг», «Імя яму — Храм». Усе гэтыя фільмы варта паглядзець. Каб адкрыць для сябе Радзіму. Каб больш разумець самога сябе як яе частку, як частку яе народа. Каб задаваць пытанні і шукаць на іх адказы. І захапляцца, і здзіўляцца, і ганарыцца, як стваральнікі тэлевізійных саг... Аб тым, што найбольш уразіла, што засталося за кадрам, аб гістарычнай праўдзе і нашай адказнасці за яе — гутарка з Міхасём РАВУЦКІМ.

Фота Іраны ГУДЗІЕЎСКАЙ

— У вашых тэматычных фільмах ці не зашмат слова «таямніца»? І ці не шкада было самім развенчваць такія прыгожыя міфы, якія ўжо самі па сабе можна было б лічыць нацыянальным здабыткам? Напрыклад, глядач з цікавасцю (а можа, з расчараваннем?) даведаецца, што верш пра слуцкіх ткачых — амаль цалкам фантазія паэта. Ці пра тое, што Барбара Радзівіл — «Чорная панна Нясвіжа» — ніколі нават у гэтым горадзе не была. Ці пра «гарбатую» труну ў саркафагу Радзівілаў: што там замест паненкі, якая замерзла седзячы,— 74-гадовая бабуля, а «горб» — гэта ваза…

— Па-першае, лічу патрэбным заўважыць адну важную рэч: мы не рабілі банальны відэадапаможнік ці ілюстраваны даведнік для экскурсаводаў і турыстычных груп… Калі б на мэце было гэта, паверце, мы маглі б пайсці па шляху найменшага супраціўлення і зняць чарговую «дакументалку» з задзейнічанымі акцёрамі пра нібы бясконцыя нясвіжскія (і не толькі) балі, мядзведжыя акадэміі і стайні з дыванамі на падлозе… Тым больш на сёння гэта без праблем: не трэба «гарадзіць» дэкарацыі — адрэстаўраваныя палацы-замкі і ёсць тая зайздросная натура, пра якую яшчэ пяць сезонаў таму можна было толькі марыць. Бяры раскадроўку — і… гадзінамі лаві патрэбныя карцінкі: захад і ўсход сонца. Але гэта іншы рафінаваны жанр, хаця і ў нас гістарычнага гламуру досыць. Мы толькі імкнуліся, каб ён не дэсанансаваў з камп'ютарнымі навацыямі, якія павыдумляла наш таленавіты рэжысёр Маша Жукава…

Што ж тычыцца «выкрыцця таямніц»… Каму ж не хочацца дакапацца да ісціны? Безумоўна, без міфаў і легенд мінуўшчына выглядае бляклавата, і на чым, як не на іх, рабіць турыстычны бізнес? Але, аказваецца, і стварэнне міфаў на пэўных гістарычных этапах некаму было выгадна. І менавіта легенды зводзілі наступныя пакаленні ад гістарычнай праўды… Возьмем аднаго з Радзівілаў — Пане Каханку… Пры вымаўленні яго імя адразу на вуснах у любога ўзнікае ўсмешка… Хто ён у легендах? Весялун, балбатун і п'яніца, ездзіў на мядзведзях па солі замест снегу… Але ўзгадайма тыя часы. Даволі напружаны перыяд між ВКЛ і Імперыяй. І акурат апошнія распускалі чуткі пра ўплывовага магната, каб падарваць аўтарытэт сапраўднага стратэга і патрыёта на міжнароднай арэне… Ну чым не інфармацыйная вайна? Паверце, сучаснымі прадстаўнікамі роду Радзівілаў прашчур таксама не ўспрымаецца комікам.

І так у шмат якіх прыкладах. Але тут галоўнае — не ўдавацца ў крайнасці… Як, напрыклад, раней дакументалісты беларускую культуру малявалі выключна ў фальклорным абліччы, а пасля раптам усе сталі магнатамі і паапраналі гарнастаяў… Нам жа хацелася выкласці нацыянальную гісторыю так, каб у іншых калег не ўзнікла жаданне нават праз дзесяцігоддзі стварацъ свой альтэрнатыўны варыянт. Мы, па сутнасці, занялі сваю нішу, у якой знайшлося месца новым цікавым звесткам, і далі слова як папулярызатарам, так і навукоўцам.

— Гледзячы вашы фільмы, шмат цікавага адкрыле для сябе нават чалавек, незнаёмы з гісторыяй краіны. Напрыклад, што на ліхтарных слупах, што на праспекце Незалежнасці ў Мінску,— арнамент слуцкіх паясоў. А што стала самым нечаканым адкрыццём для саміх аўтараў?

— Працягваючы тэму паясоў… Той жа Геранім Радзівіл, пры якім пачалі адкрывацца персіярні (першыя цэхі, дзе ткалі паясы), быў не зусім падарункам. Ён ладзіў тэатральныя пастаноўкі, яго можна назваць пачынальнікам прафесійнай сцэны, скажаце вы… А як вам такі факт: калі персанаж на сцэне тэатра Гераніма па аўтарскай задуме гінуў, то акцёра забівалі па-сапраўднаму. У такіх ролях выходзілі прыгаворваныя да смерці крымінальнікі таго часу… Пра гэта таксама не прынята казаць нават сярод сучасных прадстаўнікоў роду Радзівілаў. Зрэшты, я думаю, кожны з нас сярод продкаў жадае бачыць выключна герояў-патрыётаў і проста годных асоб. Ведаеце, якое яшчэ адкрыццё? Капаючыся ў мінулых стагоддзях, разумееш, што тэрмін «памяркоўны» — гэта не пра беларусаў. На такім скрыжаванні гарачых дарог магла выйсці толькі загартаваная сумесь. Так, мы маглі быць паліткарэктнымі, ветлівымі, гасцінными, хітрымі нават, але толькі не памяркоўнымі (а часам гэтае слова мае далёка не кампліментарны сэнс і розныя тлумачэнні). Ну не маглі нашы продкі, калі б былі памяркоўнымі, атрымаць столькі перамог, не растварыцца ў гісторыі, уплываць і на Карону, і на Імперыю, заснаваць «школу рускіх цароў» і ледзь не заняць манаршы прастол… Гэта ж нашы людзі кантрабандай і прывезлі тыя самыя першыя станкі для слуцкіх паясоў… Ці магла памяркоўная нацыя прынесці на свае землі Рэнэсанс, якога не было ў нашых усходніх суседзяў? Словам, нам ніхто акно ў Еўропу не прасякаў. Мы заўсёды былі еўрапейскімі.

Стварэнне міфаў на пэўных гістарычных этапах некаму было выгадна. І менавіта легенды зводзілі наступныя пакаленні ад гістарычнай праўды…

— Ці няма задумкі зрабіць на аснове ўжо створаных фільмаў новыя цікавыя расследаванні? Напрыклад, па пошуку радзівілаўскіх скарбаў, тых жа дванаццаці паўміфічных апосталаў?

— Вядома, гэтымі фактамі мы таксама добра «пагуляліся»… За тых апосталаў і за скарбы хто толькі не браўся! Толькі формы падачы мяняюцца. А новага не кажуць ні гісторыкі, ні архівісты. Нейкім тэмам проста неабходна даць і грамадскі, і глядацкі перадых. Дый, нарэшце, хочацца быць першапраходцам. Як гэта было і са «Статутам» і з «… паясамі»! Тут жыве рэпарцёрскі азарт. Каманда АТН займаецца «вытворчасцю расследаванняў», у аснову любога прадукту закладвае навіну і эксклюзіў. Дык вось, калі з'явяцца навіны з гістарычнага «фронту» — тут мы абавязкова «стрэлім».

— Над якімі з фільмаў было працаваць лягчэй: тымі, што звязаны з сівой даўніной, ці тымі, што датычацца найноўшай гісторыі незалежнай Беларусі? І да якіх у большай ступені адносіцца эпіграф, які вы напісалі да адной з работ: «Гістарычныя факты рэальныя. Трактоўка гісторыі заўсёды розная»?

— Працаваць цікава над любым са згаданых перыядаў. Возьмем сучаснасць. Падзеі дзякуючы інтэлекту і прагрэсу развіваюцца імкліва. За год-два мы становімся сведкамі таго, для чаго раней патрабавалася змена пакаленняў.Таму ў нейкія рэчы і з'явы проста цяжка паверыць. Нават у тое, што ўсё адбывалася з намі. Узгадайце тыя ж пустыя паліцы, прадуктовыя карткі, жорсткія моўныя баталіі, дыспуты на шляху да самавызначэння… Дарэчы, гэтыя масты і гістарычныя паралелі мы не раз праводзілі і ў тых жа «… Радзівілах», і ў «Нацыянальнай дылогіі. Статут ВКЛ», і ў «Нацыянальнай трылогіі. Герб. Гімн. Флаг»… Я з захапленнем назіраю гучную дакументалістыку іншых калег па АТН — «Судьба гигантов 1 и 2», «Независимость. Перекрёстки»… Ніхто не асмеліцца гэтыя праекты назваць выключна хранікальнымі — хутчэй, рэальна асэнсаванымі і зафіксаванымі фактамі. Праз дзесяцігоддзі па гэтых стужках без дадаткаў і зносак шкалярам можна выкладаць гісторыю пачатку дваццаць першага стагоддзя. Таму што ў іх няма зааганжаванасці, а па фактуры яны апярэджваюць падручнікі і музейныя экспазіцыйныя залы, прысвечаныя нашаму часу…

Чаго, дарэчы, не скажаш пра прэпараванне нашай старажытнай гісторыі ў савецкі час… Паверце, пад гнётам тых стэрэатыпаў яшчэ жыве і маё пакаленне, якое фарміравалася і вучылася ў вышэйшай школе на пачатку дзевяностых… Гісторыя Беларусі выкладалася з пазіцыі і савецкай, і новай гістарыяграфіі… У свядомасці многіх пачала ўтварацца каша. Раптам мы загаварылі пра ВКЛ і Рэч Паспалітую, дый пра ранейшыя княствы, у цэнтры ўтварэння якіх былі нашы землі… І вось акурат тут нам і пачалі прыпісваць тую самую «памяркоўнасць»… У тым сэнсе, што з развалам і Саюза, і наогул сацыялістычнага блока нашы гістарычныя суседзі і Літва і Польшча паспяшаліся «прыватызаваць» пэўных дзеячаў і сімвалы. (Дарэчы, напрыканцы пяцідзясятых афіцыйны Мінск добраахвотна тады яшчэ ПНР па-сяброўску падарыў частку партрэтаў Радзівілаў з нясвіжскай галерэі… А кім тады ўспрымаліся магнаты, шляхта? Вядома ж, польскімі панамі… і г.д.) А дзе ж былі мы, беларусы, увесь гэты час? Дык вось, наша задача была (яе перад намі ставіў топ-менеджмент медыяхолдынга) — каб у стужках усё было раскладзена па паліцах з пункту гледжання беларускай дзяржаўнасці. Без аглядкі на трактоўку суседзяў… Менавіта гэтым мы кіраваліся, калі збіралі факты і меркаванні з прыцягненнем шырокага кола экспертаў…

— Каму з творчага калектыву прыйшла думка далучаць да расследаванняў нечаканых экспертаў: простую ткачыху, біёлага, артыста? Наогул, творчы працэс у вас багаты на спрэчкі, ці трыа Равуцкі, Борматава, Жукава працуе ў поўнай згодзе?

— …А ёсць яшчэ мастацкая аператарска-пастановачная каманда, прадзюсарскі блок і топ-менеджмент медыяхолдынга, Белтэлерадыёкампаніі, АТН. Гэта карпаратыўныя нюансы, з якіх і складаецца вялікі эфір. Поспехам мы абавязаны і калегу па міжнародным аддзеле Анатолю Ліпецкаму — галоўнаму голасу ўсіх нашых праектаў. Прыемна, што Толя раней быў адзначаны «Тэлевяршыняй» як лепшы вядучы… Тут жа — ён за кадрам. Голасам перадаў брутальнасць і нерв. Ад некаторых ім агучаных рэчаў нават нам было страшна… Мы і тут разбурылі стэрэатып, нібы па-беларуску можна перадаць выключна «лірычны запаветны напеў»! У нас усё жыва і сучасна. Зразумее і глыбінка, і дзеці — хіпстары асфальту. І вядома ж, галоўныя нашы суаўтары — гэта эксперты. З інстытутаў Акадэміі навук, універсітэтаў, у тым ліку і замежных, навукоўцы Мірскага і Нясвіжскага замкаў, уся навуковая эліта. Столькі фактаў і меркаванняў ніхто раней не прыводзіў. Напачатку некаторыя эпізоды былі адпрацаваны і ў «Навінах» і «Панараме», «В центре внимания», аўтарскіх праграмах кшталту «Пра мастацтва». Толькі за аснову бралі інфармацыйную нагоду, навіну — мы ж найперш рэпарцёры АТН. Напрыклад, Прэзідэнт ініцыяваў праграму па адраджэнні слуцкіх паясоў… Мы пачалі капацца ў гісторыі… І раптам аказалася: дзвюххвіліннага сюжэта для гэтай тэмы мала… Ну а далей вы ўсё ведаеце, ці, дакладней, бачылі — так узнік фільм «Слуцкія паясы. Тайныя знакі». Падобныя дзяржаўныя ініцыятывы і пераўтварэнні — падказка любому дакументалісту… Набыў магілёўскі музей арыгінальны экзэмпляр «Статута» — і мы выдалі свой двухсерыйны «Статут». У АТН ёсць інтуіцыя. АТН можа рабіць не толькі якасна. У нашым выпадку за сезон было выпушчана пяць стужак у дзевяці частках. І гэта я не пералічыў астатнія гучныя праекты АТН.

— Што цікавага з усіх работ па той ці іншай прычыне засталося па-за кадрам? Аб чым вы хацелі б расказаць публіцы?

— Рэпарцёрская практыка навучыла нас выказвацца максімальна ў мінімальны час. Маецца на ўвазе троххвілінны сюжэт… Тут жа… без абмежаванняў. Нам дазволена было выходзіць за яго межы хранаметражу, абы толькі глядач на працягу нашых манументальных саг не пераключыў на іншы канал. Доказную базу мы сабралі па многіх гістарычных постацях. І некаторыя з іх вартыя асобнага расследавання… Пра Джэдзмітрыя чулі? Гэты перыяд не надта вывучаны і ўсходнімі суседзямі. Але ж у часы ВКЛ на Магілёўшчыне існавала вышэйзгаданая «школа рускіх цароў», заснаваная Сапегам… Вось і пытанне да гісторыкаў дзвюх незалежных дзяржаў: ці гатовы яны гаварыць на гэтую тэму, ці ўключаць адвечную паліткарэктнасць? Хочацца пачуць найперш прафесіяналаў, а не краязнаўцаў-аматараў з іх, можа, і прыгожымі, але ўсё ж легендамі і пэўнай зааганжаванасцю…

— Наступны творчы праект, над якім вы пачалі працаваць,— «Шляхта». Зноў «таямніцы» і расследаванне?

— Радзівілы — гэта не ўся Беларусь… Усе нашы продкі на розных этапах гісторыі вяршылі лёс нашай зямлі… Прадстаўнікі магнатэрыі, шляхты… Апошняе слова і па сёння многія памылкова перакладаюць як «дворяне». У чым памылка? Ці гэта і не будзе першай сенсацыяй новага праекта… І па гэтым адукаваным прывілеяваным саслоўі нашы беларускія землі абыходзілі і Расію, і краіны Еўропы з іхнімі «раскручанымі фаміліямі», з якімі мы, між іншым, таксама радніліся… Беларусь ніколі не была местачковай і лапатнай… Ці маглі невукі вучыцца па ўсім свеце і выпісваць да сябе на працу сусветную эліту? Будаваць такія палацы і замкі?.. Ну называлі ж нас краінай замкаў! Словам, разбяромся…

Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ

■ Факт

Спажыўцы выбіраюць смартфон

Мабільны аператар МТС канстатуе рост колькасці ва ўласнай сетцы смартфонаў і выразную тэндэнцыю пераходу карыстальнікаў ад простых тэлефонаў да «разумных». Так, за апошні год продаж смартфонаў у сетцы мабільнага аператара МТС, які абслугоўвае палову насельніцтва краіны, вырас з 10 да 25 працэнтаў.

Рост папулярнасці функцыянальных гаджэтаў (асабліва сярод моладзі) тлумачыцца патрэбай пастаянна прысутнічаць у інтэрнэце, аператыўна адказваць на паведамленні ў сацыяльных сетках і атрымліваць электронныя лісты.

Так, у 78% выпадкаў абаненты МТС выбіраюць смартфоны для мабільнага інтэрнэту. Прычым 19% апытаных прызналіся, што выходзяць у сетку праз мабільную прыладу ў любую вольную хвіліну. 72% кліентаў аператара лічаць незаменнай функцыю навігацыі, а для 63% абанентаў ключавы аргумент пры набыцці смартфона — наяўнасць магутнай мабільнай камеры.

Цікава, што кошт на смартфоны ў свеце зніжаецца, і попыт расце менавіта ў ніжнім сегменце. Але беларусы не жадаюць набываць самыя танныя мадэлі і аддаюць перавагу больш дарагім «разумным» гаджэтам з добрымі характарыстыкамі. Сярэдні кошт прададзеных смартфонаў у 2013 годзе складаў 2,8 мільёна рублёў.

Як канстатуе намеснік генеральнага дырэктара па маркетынгу кампаніі Дзяніс Цярэшчанка, цікавасць беларусаў да смартфонаў падаграюць самі сотавыя аператары, якія робяць даступнымі для сваіх кліентаў нават самыя апошнія мабільныя навінкі. Магчымасць набыць любы смартфон у растэрміноўку, не адкладваючы пакупку на нявызначаны час, забяспечыла ім каля 60% прададзеных летась у Беларусі мабільных прыладаў. Згодна з прагнозамі, продаж смартфонаў у сетцы МТС працягне імклівы рост і да канца 2014 года іх колькасць павялічыцца ўжо да 37%.

Надзея НІКАЛАЕВА

Даты | Падзеі | Людзі

1588 год — кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза зацвердзіў трэці Статут Вялікага Княства Літоўскага — збор законаў феадальнага права, унікальны помнік беларускай пісьменнасці і юрыдычнай думкі. Дзейнічаў да 1840 года. Пасля таго як быў прыняты Статут Вялікага Княства Літоўскага 1566 года, кадыфікацыйная работа не спынілася. Ужо на Брэсцкім сейме ў 1566 годзе было папраўлена некалькі артыкулаў. Праз 2 гады Гродзенскі сейм унёс папраўкі ў некаторыя артыкулы і стварыў камісію для дапрацоўкі Статута. Камісія для выпраўлення Статута была выбрана і на Люблінскім сейме ў 1569-м. Крыніцы для распрацоўкі Статута 1588 года — Статуты ВКЛ 1529 і 1566 гг. сеймавыя пастановы, прывілеі, пастановы павятовых сеймікаў. Да канца 1584 года работа над Статутам была скончана, але ў сувязі з тым, што ён ігнараваў акт Люблінскай уніі 1569 года, прадстаўнікі Польшчы не дапускалі яго зацвярджэння на агульным сейме Рэчы Паспалітай. Каб захаваць велікакняжацкі трон, Жыгімонт III Ваза зацвердзіў Статут сваім прывілеем 28 студзеня 1588 года. Трэці статут Вялікага Княства Літоўскага падрыхтаваны на высокім тэарэтычным узроўні кваліфікаванымі прававедамі пад кіраўніцтвам канцлера ВКЛ А. Б. Валовіча і падканцлера Л. І. Сапегі. У Статут увайшлі нормы дзяржаўнага (канстытуцыйнага) права, чаго на той час не было ў заканадаўчай практыцы іншых еўрапейскіх дзяржаў. Ён абагульніў тагачасныя дзяржаўна-прававыя ідэі, некаторыя з якіх апярэджвалі свой час. У Статуце знайшла адлюстраванне тэорыя падзелу ўлады на заканадаўчую (сейм), выканаўчую (вялікі князь, адміністрацыйны апарат) і судовую (Трыбунал ВКЛ, земскія і падкаморскія суды, выбарныя і незалежныя ад адміністрацыі). Статут юрыдычна замацаваў фактычную адасобленасць ВКЛ ад Польшчы ў федэрацыйных межах Рэчы Паспалітай, што працягвалася і пасля падпісання акта Люблінскай уніі.

1919 год — 95 гадоў таму нарадзіўся (г. Казань, Татарстан) Павел Васільевіч Кармунін, акцёр, народны артыст Беларусі (1980). У 1964–1993 гадах працаваў у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Сыграў больш за 200 роляў. Сярод іх: Сцяпан Крыніцкі («Паўлінка» Я. Купалы), Кічкайла («Амністыя» М. Матукоўскага), Лука («На дне» М. Горкага) і многія іншыя. Зняўся ў кінафільмах «Красная плошча», «Рудабельская рэспубліка», «Доўгія вёрсты вайны», «Дзяржаўная граніца». Памёр у 2002 годзе.

1938 год — нарадзіўся Валянцін Уладзіміравіч Мураўёў, беларускі вучоны, член-карэспандэнт НАН Беларусі (1989), доктар тэхнічных навук (1977), прафесар (1978), заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі (1988). Аўтар больш як 250 навуковых прац, у тым ліку 35 вынаходак і 13 патэнтаў. Навуковыя даследаванні ў галіне генерыравання і ўзмацнення электрамагнітных ваганняў звышвысокіх і вельмі высокіх частот. Прапанаваў новы спосаб павышэння стабільнасці частаты, прапанаваў агульны метад разліку, які дазваляе з адзіных пазіцый аналізаваць і разлічваць аўтагенератара, сінхранізаваныя генератары і ўзмацняльнікі на паўправадніковых прыборах з улікам канкрэтнага спосабу рэалізацыі ЗВЧ сістэмы і параметраў актыўнага элемента.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

«Дзе воўк урадзіўся,
Яму куст той мілы».

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 24 студзеня. Месяц у сузор'і Казярога.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 9.03	17.43	8.40
Віцебск	— 8.58	17.27	8.29
Магілёў	— 8.53	17.33	8.40
Гомель	— 8.44	17.35	8.51
Гродна	— 9.18	17.59	8.41
Брэст	— 9.12	18.05	8.53

Імяніны

Пр. *Гаўрылы, Івана, Паўла, Прохара.*
К. *Агнешкі, Аманды, Карыны, Валерыя, Пятра, Тамаша.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА -12..-10°С	КІЕЎ -15..-13°С	РЫГА -10..-8°С
ВІЛЬНЮС -16..-14°С	МАСКВА -21..-19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ -15..-13°С

УСМІХНЕМСЯ

Каб жонка не знайшла маю схованку, я захоўваю яе ў правай ніжняй кішэні другога сярэдняга аддзялення яе сумачкі.

Бос звяртаецца да падначаленых:
— Слухайце, перастаньце вы называць мяне «бос», «шэф». Дзеля чаго гэтая зусім чужая нам іншамоўная паслужлівасць? Не люблю я гэтага...
— А як вас называць?
— Ды божухна! Ну, прасцей як-небудзь... Напрыклад, «карміцель»...

Я ненавіджу тых, хто пазіцыянуе сябе як вельмі культурны чалавек, размаўляючы пра Моцарта, і пры гэтым нават не бачыў ні адной з яго карцін!

Жонка заяўляе мужу:
— Я падаю на развод. Машыны дзелім папалам: мне — «Лексус», табе — пральную.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 22.817. Індэкс 63850. Зак. № 393.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 27 студзеня 2014 года.